## *МОВАЗНАЎСТВА*

*УДК 1751*

*В. І. КУРАЦЁВА*

# АДМЕТНЫЯ РЫСЫ Ў ПРАСАДЫЧНАЙ ВЫЯВЕ СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ ГАВОРАК

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 08.10.2013)*

Антрапацэнтрычная накіраванасць сучаснай лінгвістыкі ставіць у фокус актуальнасці навуковых пошукаў працэс і прадукт чалавечай моўнай дзейнасці – вуснае маўленне. Пільную ўвагу як замежных, так і айчынных навукоўцаў прыцягваюць моўныя з'явы, якія забяспечваюць эфектыўнасць праходжання працэсу камунікацыі. Сярод іх важнейшае месца займае прасодыя, паколькі яна з'яўляецца тым сродкам, які выконвае функцыю актуалізатара камунікатыўнага намеру гаворачай асобы і, у сукупнасці з іншымі лінгвістычнымі элементамі, выступае ў якасці індыкатара разнастайных характарыстык прамоўцы: сацыяльных, псіхалагічных, сітуатыўных [1; 2]. Асаблівае значэнне прасадычныя рысы набываюць і ў вызначэнні прыналежнасці чалавека да пэўнага лінгвагеаграфічнага рэгіёна, у раскрыцці яго як прадстаўніка адной з груп тэрытарыяльных гаворак.

Зварот айчыннага мовазнаўства ў другой палове ХХ стагоддзя да раскрыцця моўнага партрэта асобы ў розных рэгіёнах Беларусі дазволіў дыялектолагам дасягнуць значных поспехаў. У фундаментальных працах «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы», «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх народных гаворак», «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» і манаграфічных даследаваннях Ю. Ф. Мацкевіч [3], Н. Т. Вайтовіч [4], М. А. Жыдовіч [5], М. В. Бірылы [6], Ф. Д. Клімчука [7], І. Я. Яшкіна [8] і іх калег былі акрэслены межы групоўкі беларускіх народных гаворак, вызначаны тэрыторыі распаўсюджвання дыялектных зон, падрабязна апісаны фанетычныя, марфалагічныя, лексічныя, акцэнталагічныя і сінтаксічныя рысы рэгіянальнага маўлення. Акрамя таго, былі паспяхова вырашаны праблемы генезісу беларускіх гаворак, высветлены характар узаемадзеяння дыялектаў Беларусі з дыялектамі іншых усходне- і заходнеславянскіх моў у працэсе іх гістарычнага развіцця [9; 10].

Варта заўважыць, што ў той час, як намаганнямі лепшых навукоўцаў былі сістэматызаваны разнастайныя акалічнасці карціны гукавога вымаўлення ў розных рэгіёнах Беларусі, вывучэнне фразавай прасодыі гаворак так і засталося не праведзеным ні ў адной з айчынных навуковых лабараторый. Падставу распачаць пошук супрасегментных з'яў дае наяўнасць рэгіянальных адрозненняў гукавога ўзроўню, выяўленых на прасторы функцыянавання беларускага маўлення. Разам з гэтай акалічнасцю, цікавасць да вывучэння прасодыі гаворак стымулюе і той факт, што ў працэсе анталагічнага развіцця моўнай асобы ў яе ментальнай прасторы першай праходзіць станаўленне менавіта супрасегментная лінія, на якую як другасная некалькі пазней накладваецца лінія манэмічная [11; 12]. Першаснасць станаўлення прасодыі спрыяе яе моцнаму ўкараненню, якое застаецца трывалым нават тады, калі асоба мяняе моўнае асяроддзе на блізкароднаснае або пачынае выкарыстоўваць асвоены пазней замежны лінгвістычны код. З гэтай прычыны, думаецца, што факт выяўленасці рэгіянальных адрозненняў з боку сегментаў (як больш позніх фарміраванняў) не можа быць ізаляваным ад стану прасадычных з'яў: паколькі супрасегмент-

ныя структуры ляжаць у аснове станаўлення мовы і прымаюць удзел у працэсе перадачы сэнсу выказвання, то яны таксама павінны адрозніваць мову аднаго рэгіёна ад іншых у краіне.

Для праверкі выказанай гіпотэзы спатрэбілася правядзенне эксперыментальна-фанетычнага даследавання, адной з асноўных задач якога з'явілася высвятленне меладычных асаблівасцей прасодыі беларускіх гаворак. Удзельнікамі эксперымента выступілі студэнты факультэтаў замежных моў[1] БрДУ імя А. Пушкіна (Брэст), ГДУ імя Ф. Скарыны (Гомель), МДУ імя А. Куляшова (Магілёў), ПДУ (Полацк), МДЛУ (Мінск) са спецыялізацыяй «Беларуская мова і літаратура». Сярод іх было праведзена пісьмовае апытанне і па яго выніках для запісу маўлення былі адабраны карэнныя жыхары пяці рэгіёнаў, якія па ўласнай ацэнцы добра валодаюць беларускай мовай і з'яўляюцца гарадскімі і сельскімі прадстаўнікамі наступных гаворак:

- *заходнепалескіх* – выхадцы з раёнаў Брэста, Пружан, Маларыты, Драгічына, Пінска, Камянца;
- *полацкіх* – жыхары рэгіёнаў Полацка, Наваполацка, Чашнікаў, Бешанковічаў;
- *усходнемагілёўскіх* – прадстаўнікі тэрыторыі Магілёва, Мсціслава, Крычава, Чавусаў;
- *гродзенска-баранавіцкіх* – насельнікі раёнаў Гродна, Дзятлава, Ваўкавыска, Баранавіч, Ляхавіч;
- сярэднебеларускіх, а іменна *гомельскіх*[2], – выхадцы з раёнаў Гомеля, Веткі, Добруша, Рэчыцы, Светлагорска[3].

У якасці матэрыялу быў абраны звязаны тэкст[4], які патрабавалася агучыць выразна, у сярэднім тэмпе, набліжаючы чытанне ўслых да апавядання. Для кожнага рэгіёна было зроблена 25–30 запісаў, што склала больш 120 прыкладаў гучання рэгіянальнага маўлення. Атрыманыя матэрыялы былі прад'яўлены інфармантам – пяці вопытным выкладчыкам беларускай мовы. У іх задачу ўваходзіла ацаніць маўленне падыспытных, ужываючы наступныя крытэрыі: узровень валодання беларускай мовай, натуральнасць гучання і камфортнасць успрымання на слых[5], узровень валодання нормай вымаўлення, адэкватнасць перадачы логіка-семантычнага і мадальна-прагматычнага зместу тэксту. У выніку былі адабраны 43 найлепшыя запісы рэгіянальнага маўлення агульнай працягласцю гучання на беларускай мове 427 хвілін.

Дадзеныя запісы склалі матэрыял для аўдытыўнага аналізу, да якога былі запрошаны спрактыкаваныя фанетысты-даследчыкі – лінгвісты са свабодным валоданнем беларускай мовай. Ім было прапанавана выканаць наступныя заданні ў маналагічнай частцы тэкстаў: вызначыць межы сінтагматычнага члянення, абазначыць лакалізацыю фразавых акцэнтаў, указаць іх тып (поўныя, частковыя, ядзерныя) і характар вышынна-меладычных змяненняў.

Апрацоўка атрыманых даных праводзілася з мэтай выяўлення характэрных для кожнага рэгіёна танальных контураў і тыпаў меладычнага завяршэння ў нефінальных сінтагмах.

Танальныя контуры былі вылучаны ў цэнтр даследавання таму, што яны здольны прадставіць істотны аб'ём інфармацыі аб тэрытарыяльных мадыфікацыях вымаўлення і скласці жывое ўяўленне аб яго гучанні. Гэта аказваецца магчымым дзякуючы таму, што танальны контур, па-першае, з'яўляецца структурным комплексам, які змяшчае ў сабе ўсе функцыянальныя адзінкі сінтагмы (ядро, шкалу, заядзерную частку, прадшкалу) і прадстаўляе іх на дадзеным участку маўленчай плыні ў цесным узаемадзеянні, і, па-другое, таму, што ён выступае матэрыяльным носьбітам сэнсавага зместу асобных частак выказвання [13].

Падставай для канцэнтрацыі ўвагі на аналізе прасодыі нефінальных сінтагм паслужыла тое, што выбар прамоўцай ядзернага тону на дадзеных участках фраз менш залежыць ад каму-

---

[1] Выбар падыспытных, якія вывучаюць замежныя мовы, абумоўлены мэтай другой часткі даследавання, якая прадугледжвае аналіз праяўлення характарыстык прасодыі роднай мовы ў маўленні на замежнай.

[2] Тут і далей у тэксце будзе ўжывацца тэрмін «гомельскія гаворкі», паколькі сярэднебеларускія гаворкі з'яўляюцца міждыялектным структурным тыпам і не разглядаюцца дыялектолагамі як гамагеннае лінгвістычнае фарміраванне.

[3] Зыходзячы з назваў гаворак, у артыкуле будуць выкарыстаны аднайменныя спасылкі на рэгіёны іх распаўсюджвання: Заходнепалескі, Полацкі, Усходнемагілёўскі, Гродзенска-баранавіцкі, Гомельскі рэгіён.

[4] Тэкст быў прад'яўлены падыспытным на дзвюх мовах: беларускай і англійскай. Англійскі варыянт тэксту – адаптаваны ўрывак з апавядання М. Твэна «Банкнота ў мільён фунтаў стэрлінгаў» – быў перакладзены на беларускую мову, яго аб'ём налічвае 590 слоў, або 3500 сімвалаў з прабеламі.

[5] Дадзены крытэрый прадугледжвае маўленне, характэрнае для жывых чалавечых зносін носьбітаў мовы са зразумелым вымаўленнем слоў, сярэднім тэмпам маўлення, адсутнасцю шматлікіх запінак, агаворак, паўз вагання.

нікатыўнага тыпу выказвання і ў значнай ступені звязаны з кампазіцыяй і семантыкай інтанацыйнай групы [14]. Менавіта гэта разглядалася ўмовай, якая спрыяе пераўтварэнню ядзернага кампанента нефінальнай сінтагмы ў патэнцыяльную зону праяўлення прыкмет рэгіянальнага паходжання.

1. Правядзём параўнальны аналіз контураў, якія вылучыліся як тыповыя ў кожным з даследаваных рэгіёнаў.

Згодна з мал. 1, найбольш тыповымі ў рэалізацыях прадстаўнікоў **гомельскіх гаворак** з’яўляюцца меладычныя мадэлі № 3 з хуткім змяненнем танальнага руху і яго шырокім інтэрвалам (32,8%). Яны фарміруюць моцна зрэзаны танальны контур і выступаюць у трох наступных спалучэннях:

• нізкая шкала з наступнай рэалізацыяй тэрмінальных тонаў на найвышэйшым узроўні дыяпазону голасу. Напр.: *«Каˎлі ˌя прыˎехаў у ^Лондан...», «...міˏнаючы баˏгаты ма^ёнтак...», «...аˏле замест ^гэтага...»;*

• шкала з перапыненай паступовасцю ў камбінацыі з высокімі/звышвысокімі ўзыходнымі/узыходна-сыходнымі тонамі. Напр.: *«Каˊлі ˌя прыˏехаў у ⁻ˊЛондан...», «...ла↗кей адчыˏніў ˊ¯дзверы...», «...і ˊхутка даˊведаліся ˏўсё пра мяˊне...»;*

• контуры без шкалы, утвораныя высокімі/звышвысокімі ўзыходнымі/узыходна-сыходнымі тонамі. Напр.: *«Са^мотна ¦ я баˎдзяўся па ˏ∧вуліцах, ⦚ калі ⁻ˊ раптам...», «...але заˌмест ^гэтага ¦ джэнтльˊ^мены...», «Неўза^баве ¦ лаˊкей ¦ адчыˏніў ˊ¯дзверы...».*

Найбольш тыповымі контурамі **полацкіх гаворак** з’яўляюцца танальныя мадэлі № 2, прадстаўленыя сярэднімі/нізкімі ўзыходнымі/узыходна-сыходнымі тонамі з сярэднімі/нізкімі роўнымі шкаламі або без шкалы (39,1%). Такія ж меладычныя малюнкі найчасцей сустракаюцца і ў матэрыяле **ўсходнемагілёўскіх гаворак** (32,1%). Аднак у той час як сярод адзначаных найбольш характэрных для Полацкага рэгіёна контураў большую долю складалі структуры з узыходнымі тонамі, то для Усходнемагілёўскага – з узыходна-сыходнымі (табл. 1). Напр., полацкія гаворкі: *«Уˏжо ˌдва /дні ¦ я ніˏчога не /еў...», «...міˏнаючы баˏгаты маˏ – ёнтак...», «...Неўза∧баве ¦ ла↷кей адчыˌніў ˏ – дзверы...»;* усходнемагілёўскія: *«...бо а∧дзенне маˌё быˌло ⦚ ста∧рое...», «...аˏле заˏмест ∧гэтага ¦ .джэнтль/мены...», «∧Дзейнічайце ¦ не спя∧шаючыся».*

Асноўным прасадычным маркерам **гродзенска-баранавіцкіх** і **заходнепалескіх гаворак** з’яўляецца дамінуючае выкарыстанне сыходных меладычных узораў №1 (35,0 і 28,9% суадносна), утвораных сярэднімі/нізкімі ядзернымі сыходнымі тонамі і сярэдняй/нізкай шкалой або без шкалы. Дадзеныя контуры пераважаюць у фінальных інтанацыйных групах і ствараюць тым самым эфект меладычнасці маўлення жыхароў Паўднёва-Заходняй Беларусі. У дапаўненне аўды-




Мал. 1. Размеркаванне найбольш тыповых танальных контураў у маўленні прадстаўнікоў розных груп беларускіх гаворак (працэнтныя долі контураў тыпаў 1–6 складаюць у суме 100%; колькасныя суадносіны контураў тыпу 7 вызначаліся асобна ад змешчаных пад лічбамі 1–6 у долях ад 100%. Класіфікацыя танальных контураў менавіта на такія тыпы і іх падлік па адзначанай методыцы былі прадыктаваны спецыфікай маўлення ўдзельнікаў эксперымента)

тарамі было адзначана, што маўленне прадстаўнікоў гродзенска-баранавіцкіх гаворак характарызуецца пераважнай лакалізацыяй меладычных хваляў у сярэднянізкім галасавым дыяпазоне з невялікімі амплітудамі танальных хістанняў. Напр.: *«...ва ˏўсім гэтым вяˏлікім ˎгорадзе», «...уладка|ваць мяне на ˎпрацу...», «...міˏнаючы баˏгаты маˎёнтак...».*

Т а б л і ц а 1. **Суадносіны танальных контураў з сярэднімі/нізкімі ўзыходнымі і ўзыходна-сыходнымі контурамі, %**

| Тыпы ТК \ Тыпы гаворак | | Гомельскія | Полацкія | Усходне-магілёўскія | Гродзенска-баранавіцкія | Заходне-палескія |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ТК з сярэднімі/ нізкімі ўзыходнымі/ узыходна-сыходнымі тонамі | Агульная колькасць | 24,32 | 39,05 | 32,06 | 27,22 | 26,70 |
| | Доля ТК з узыходнымі тонамі | 13,39 | **27,30** | 12,94 | 15,56 | 14,64 |
| | Доля ТК з узыходна-сыходнымі тонамі | 10,93 | 11,75 | **19,12** | 11,67 | 12,06 |

З а ў в а г а. ТК – танальны контур.

Акрамя сыходных меладычных контураў **заходнепалескім гаворкам** уласціва выкарыстанне мадэляў з экспрэсіўнымі шкаламі (28,3%). Яны складаюць амаль трэць танальных малюнкаў у матэрыяле дадзенага рэгіёна і надаюць тым самым маўленню Заходняга Палесся асаблівае адценне выразнасці. Напр.: *«...Ка↷лі я пры↷ехаў у ^Лондан...», «...↗Самотна я ба↗дзяўся па ˎвуліцах...», «...Я ча↷каў, што мне ^скажуць, | для ча↗го мя↗не паˎклікалі...».*

2. Вывучэнне <u>ядзерных тонаў нефінальных сінтагм</u> з уласцівым ім логіка-мадальным значэннем адноснай незавершанасці выказвання паказвае, што малюнак рэалізацыі частотных танальных контураў у маўленні падыспытных заканамерна праецыруецца на асаблівасці ўжывання характэрных тыпаў меладычнага завяршэння ў нефінальных сінтагмах.

Мал. 2 дэманструе агульную карціну размеркавання найбольш частотных ядзерных тонаў у даследуемых гаворках. Табл. 2 адлюстроўвае працэнтныя суадносіны ўсіх тыпаў танальнага завяршэння і іх узроўневых разнавіднасцей у нефінальных інтанацыйных групах эксперыментальнага матэрыялу.

Як відаць з мал. 2 і табл. 2, **гомельскія гаворкі** характарызуюцца найбольшай доляй выкарыстання ўзыходных тонаў (39,0%), якія маюць пераважна сярэднюю і высокую разнавіднасці (18,3 і 16,7%). Узыходна-сыходныя тоны назіраюцца ў маўленні прадстаўнікоў дадзенага рэгіёна таксама часта (36,9%), прычым, як правіла, у іх высокіх варыянтах (22,3%). Згодна з успрыманнем усіх аўдытараў, малюнак уздыму прадстаўляе сабой вельмі хуткі і рэзкі танальны рух уверх ад нізкага або сярэднянізкага рэгістра голасу да высокага і найвышэйшага, што станоўча адрознівае маўленне выхадцаў з паўднёва-ўсходняга рэгіёна.




Мал. 2. Тыпы танальнага завяршэння ў нефінальных сінтагмах, рэалізаваных прадстаўнікамі розных груп беларускіх гаворак, %

Т а б л і ц а 2. **Суадносіны ядзерных тонаў у нефінальных сінтагмах эксперыментальнага матэрыялу, %**

| Тып гаворак | Тып ядзернага тону ў нефінальных сінтагмах, % | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | сыходны | | | | узыходны | | | | узыходна-сыходны | | | | роўны |
| | высокі | сярэдні | нізкі | агульная колькасць | высокі | сярэдні | нізкі | агульная колькасць | высокі | сярэдні | нізкі | агульная колькасць | |
| ГГ | 1,6 | 4,3 | 17,1 | 23,0 | **16,7** | **18,3** | 4,0 | **39,0** | **22,3** | 12,7 | 2,0 | **36,9** | 1,1 |
| ПГ | 0,9 | 8,1 | 12,3 | 21,3 | 11,9 | **32,2** | 9,4 | **53,5** | 7,4 | 14,9 | 0,4 | 22,7 | 2,4 |
| УМ | 1,9 | 4,9 | 14,4 | 21,1 | 7,0 | 15,5 | 8,3 | 30,8 | **19,4** | **18,1** | 3,6 | **42,1** | 6,0 |
| ГБ | 1,6 | 15,7 | 27,6 | **44,9** | 5,4 | 20,0 | 3,7 | 29,1 | 7,0 | 12,8 | 3,2 | 23,0 | 3,1 |
| ЗП | 5,0 | 11,2 | 21,3 | **37,4** | 6,8 | 17,8 | 4,3 | 28,9 | 13,5 | 15,4 | 3,4 | 32,3 | 1,3 |

З а ў в а г а. ГГ – гомельскія гаворкі, ПГ – полацкія гаворкі, УМ – усходнемагілёўскія гаворкі, ГБ – гродзенска-баранавіцкія гаворкі, ЗП – заходнепалескія гаворкі.

**Полацкім гаворкам**, як і гомельскім, але ў колькасці, значна перавышаючай апошнія, уласцівы ўзыходныя тоны (53,5%) з іх дамінуючай рэалізацыяй у сярэднім галасавым дыяпазоне (32,2%).

**Усходнемагілёўскія гаворкі** вызначаюцца найбольшым працэнтам ужывання ўзыходна-сыходных тонаў высокай і сярэдняй разнавіднасцей (19,4 і 18,1%). Другое месца ў іх па частотнасці выкарыстання займаюць узыходныя тоны (30,8%), што ў некаторай ступені набліжае разглядаемыя гаворкі да гомельскіх, але, у адрозненне ад апошніх, маўленне выхадцаў з Усходнемагілёўскага рэгіёна прадстаўляе сабой больш спакойны меладычны рух, які рэалізуецца пераважна ў сярэднім галасавым дыяпазоне.

Адметнасць **гродзенска-баранавіцкіх гаворак** прадстаўляе пераважная колькасць сыходных тонаў у нефінальных сінтагмах (44,9%) з найбольшай доляй выкарыстання нізкай разнавіднасці дадзенага тону.

Асаблівымі рысамі **заходнепалескіх гаворак** выступаюць дзве: па-першае, тыповае ўжыванне сыходных тонаў (37,4%), аднак у меншай колькасці, чым прадстаўнікамі Гродзенска-баранавіцкага рэгіёна, а па-другое, невялікая розніца паміж долямі ўжывання ўзыходных (28,9%), узыходна-сыходных (32,3%) і сыходных (37,4%) тыпаў танальнага завяршэння. Фактычна кожны з дадзеных тонаў сустракаецца ў матэрыялах Заходняга Палесся амаль у трэці выпадкаў.

Па выніках аналізу мелодыі рэгіянальнага маўлення Беларусі і разгляду яе асаблівасцей як паказчыка тэрытарыяльнай прыналежнасці прамоўцы можна зрабіць наступныя вывады:

1) *гомельскія* гаворкі вызначаюцца найбольшым працэнтам ужывання высокіх узыходных і ўзыходна-сыходных тонаў пераважна ў складзе меладычных контураў з хуткім змяненнем танальнага руху і яго шырокім інтэрвалам;

2) *полацкім* гаворкам уласціва дамінуючае выкарыстанне ўзыходных тонаў у нефінальных сінтагмах часта ў камбінацыі з сярэднімі/нізкімі шкаламі;

3) тыповымі для *ўсходнемагілёўскіх* гаворак з’яўляюцца ўзыходна-сыходныя тоны высокай і сярэдняй разнавіднасцей пераважна з рэалізацыяй папярэдняй часткі контуру ў сярэднім дыяпазоне голасу;

4) для *гродзенска-баранавіцкіх* гаворак характэрна высокая колькасць сыходных тонаў у нефінальных сінтагмах, таксама як і дамінуючае выкарыстанне сыходных меладычных узораў сярэднянізкага галасавога дыяпазону з невялікімі амплітудамі танальных хістанняў;

5) асаблівымі рысамі *заходнепалескіх гаворак* выступаюць, па-першае, невялікая розніца паміж долямі ўжывання ўзыходных, узыходна-сыходных і сыходных тыпаў танальнага завяршэння, па-другое, частотнае выкарыстанне сыходных меладычных узораў і контураў з экспрэсіўнымі шкаламі.

Вывучэнне адметных рыс меладычнай падсістэмы розных груп беларускіх гаворак даказвае наяўнасць шэрагу спецыфічных асаблівасцей маўлення на дыялектным ландшафце краіны. Вынікі аўдытыўнага аналізу дэманструюць маркіраванне кожнай з даследаваных гаворак рэгіянальнымі рысамі і раскрываюць асаблівасць кожнай з іх па прыкметах частотнасці ўжывання характэрных танальных контураў і размеркаванню тыпаў меладычнага завяршэння ў нефінальных сінтагмах.

## Літаратура


1. *Поплавская, Т. В.* Коммуникативный аспект формообразующих элементов просодии и эффективность речевого общения / Т. В. Поплавская // Актуальные проблемы коммуникативной фонетики и вопросы эффективности общения. Материалы междунар. конф. Минск, 29–30 мая 1997 г.; сост. Л. Т. Выгонная, Т. В. Поплавская. – Минск: МГЛУ, 1997. – С. 3–9.
2. *Сусов, И. П.* Личность как субъект языкового общения / И. П. Сусов // Личностные аспекты языкового общения: межвуз. сб. науч. ст. / Калининский гос. ун-т; редкол: И. П. Сусов [и др.]. − Калинин: КГУ, 1989. − С. 9–16.
3. *Мацкевіч, Ю. Ф.* Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове / Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1959. – 292 с.
4. *Вайтовіч, Н. Т.* Ненацiскны вакалізм народных гаворак Беларусі / Н. Т. Вайтовіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1968. – 219 с.
5. *Жыдовіч, М. А.* Назоўнік у беларускай мове. Ч. 1. Адзіночны лік / М. А. Жыдовіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1969. – 230 с.
6. *Бірыла, М. В.* Націск назоўнікаў у сучаснай беларускай мове / М. В. Бірыла. – Мінск: Выш. шк., 1986. – 144 с.
7. *Клімчук, Ф. Д.* Гаворкі Заходняга Палесся: Фанетычны нарыс / Ф. Д. Клімчук. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 127 с.
8. *Яшкін, І. Я.* Узаемадзеянне рознадыялектных сістэм. Марфалогія. Сінтаксіс / І. Я. Яшкін. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 103 с.
9. *Крывіцкі, А. А.* Дыялекталогія беларускай мовы: дапаможнік / А. А. Крывіцкі. – Мінск: Выш. шк., 2003. – 294 с.
10. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак / АН БССР. Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; пад рэд. Р. І. Аванесава, К. К. Атраховіча, Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1968. – 320 с.
11. *Барышникова, К. К.* Уровни анализа просодии и ее функции / К. К. Барышникова // Экспериментальная фонетика. – Минск: МГПИИЯ, 1975. – С. 4–23.
12. *Винарская, Е. Н., Касевич, В. Б.* Слоги и фонемы в речевой и речемыслительной деятельности / Е. Н. Винарская, В. Б. Касевич // Физиология человека. – 1977. – № 1. – Т. 3. – С. 63–71.
13. *Метлюк, А. А.* Взаимодействие просодических подсистем в речи билингва / А. А. Метлюк. – Минск: Высш. шк., 1986. – 123 с.
14. Практическая фонетика английского языка: учеб. пособие для вузов / Е. Б. Карневская [и др.]; под общ. ред. Е. Б Карневской. – Минск: Симон, 2003. – 255 с.



*V. I. KURATIOVA*


**SPECIFIC PROSODIC FEATURES OF THE CONTEMPORARY BELARUSSIAN SUBDIALECTS**

## Summary


The article is devoted to the study of distinctive prosodic features of five Belarusian subdialects. The conducted experiment proves that regionally marked speech has its peculiar suprasegmental characteristics, especially on the melodic level. The analysis shows that each of the studied subdialects can be distinguished by the most typical pitch contours and the quantitative distribution of different types of nuclear tones in non-final intonation groups.